# ЧАСТКОВАЕ ПАГАДНЕННЕ АБ МОЛАДЗЕВАЙ МАБІЛЬНАСЦІ ПА МОЛАДЗЕВЫХ КАРТАХ



Мір
сацыяльная згуртаванасць
міжкультурны дыялог
палітычны ўдзел
правы чалавека
дэмакратычнае грамадзянства
даследаванні

Развіццё
моладзевай
палітыкі

partial agreement on youth mobility through the EUROPEAN YOUTH CARD

COUNCIL OF EUROPE
CONSEIL DE L'EUROPE




## ШТО ТАКОЕ ЧАСТКОВАЕ ПАГАДНЕННЕ?

Частковае пагадненне з’яўляецца адной з формаў супрацоўніцтва ў межах Савета Еўропы. Яно дазваляе краінам, якія далучыліся да пагаднення, браць удзел або ўстрымлівацца ад удзелу ў той або іншай дзейнасці, за якую выступаюць іншыя краіны-сябры арганізацыі. З пункту погляду Статута, частковае пагадненне – гэта такая ж дзейнасць Савета Еўропы, як і іншыя яго праграмы. Адзіная розніца палягае ў тым, што частковае пагадненне мае свой уласны бюджэт і ўласныя метады працы, якія вызначаюцца толькі яго ўдзельнікамі.

## ЧАСТКОВАЕ ПАГАДНЕННЕ АБ МОЛАДЗЕВАЙ МАБІЛЬНАСЦІ ПА МОЛАДЗЕВЫХ КАРТАХ

Гэтае Частковае пагадненне з’яўляецца адкрытым, гэта значыць, да яго маюць права далучацца краіны, якія не ўваходзяць у Савет Еўропы або якія не бяруць удзел у Еўрапейскай культурнай канвенцыі (гл. ніжэй).

Частковае пагадненне ўваходзіць у сферу дзейнасці Дэпартамента Савета Еўропы па справах моладзі, і таму яно пераймае прыярытэты і мэты як моладзевага сектару, гэтак і Савета Еўропы ў цэлым.

## МЭТЫ:

### 1. Стварэнне сістэмы моладзевых карт

Статут Частковага пагаднення, заключанага ў 1991 годзе, сцвярджае: «Частковае пагадненне будзе скіраванае на стварэнне, у першую чаргу на еўрапейскім узроўні, сістэмы моладзевых карт [...] каб спрыяць моладзевай мабільнасці і доступу маладых людзей да шэрагу тавараў і паслугаў, неабходных для іх асабістага і культурнага развіцця». Уласнікам моладзевай карты можа стаць любы чалавек узростам да 30 гадоў, для гэтага яму не абавязкова быць студэнтам або жыць у еўрапейскай краіне.

Моладзевыя карты забяспечваюць маладым людзям – як мясцовым жыхарам так і прыезджым – доступ да інфармацыі, зніжак ды ільготаў у сферах мабільнасці, жылля, культуры, пры наведванні моўных курсаў, карыстанні прадуктамі і паслугамі як анлайн (паводле катэгорыяў, гарадоў і краінаў), гэтак і афлайн. Каб павялічыць доўгатэрміновы станоўчы эфект, вялікая ўвага надаецца павышэнню якасці і кантролю за якасцю прапанаваных паслугаў.

### 2. Супольная распрацоўка больш эфектыўнай моладзевай палітыкі для краін-удзельніц.

Другая мэта пагаднення скіраваная на задавальненне інтарэсаў і патрэбаў урадаў краін-удзельніц у пытаннях моладзевай мабільнасці і моладзевых карт. Праграма працы складаецца з семінараў, практыкумаў, сімпозіюмаў і г.д., на якіх удзельнікі генеруюць и мабілізуюць веды па гэтых пытаннях, дзеляцца лепшымі практыкамі і ў выніку могуць прапаноўваць больш эфектыўныя палітычныя рашэнні. Па выніках гэтых мерапрыемстваў робяцца публікацыі, якія падсумоўваюць перадавы досвед і ўтрымліваюць канкрэтныя рэкамендацыі для краін-удзельніц і нацыянальных арганізацыяў, якія ўваходзяць у Еўрапейскую асацыяцыю моладзевых карт (EYCA).

Краіны, якія не ўваходзяць у Частковае пагадненне, бяруць удзел у праграме за ўласны кошт. Выдаткі прадстаўнікоў краін-удзельніц цалкам пакрываюцца.

Да рэалізацыі гэтай мэты прыцягваецца шырокае кола зацікаўленых асобаў: урады, еўрапейскія інстытуты, бізнэс-супольнасць, эксперты, навукоўцы, моладзевыя няўрадавыя арганізацыі, нацыянальныя арганізацыі моладзевых карт і самі маладыя іх уласнікі. Такім чынам, краіны-ўдзельніцы адначасова робяць актыўны ўнёсак у Частковае пагадненне і карыстаюцца ягонымі экспертнымі напрацоўкамі.

## ЯК ВЯДЗЕЦЦА ГЭТАЯ ПРАЦА?

За праграмай мерапрыемстваў назірае каардынацыйная рада, якая складаецца з сямнаццаці чальцоў:

- восем прадстаўнікоў краін-удзельніц Частковага пагаднення, прызначаных Камітэтам міністраў Савета Еўропы;
- восем чальцоў Еўрапейскай асацыяцыі моладзевых карт, прызначаных апошняй;
- адзін прадстаўнік без права голасу, прызначаны Кансультатыўнай радай па справах моладзі.

Праграма працы ў межах Частковага пагаднення здзяйсняецца у супрацоўніцтве з Еўрапейскай асацыяцыяй моладзевых карт (EYCA). Гэта некамерцыйная асацыяцыя, заснаваная ў 1987 годзе. Яна прадстаўляе больш за сорак нацыянальных арганізацыяў моладзевых карт з усёй Еўропы, якія аб’ядноўваюць больш за пяць мільёнаў карыстальнікаў. Усе ўдзельнікі EYCA забавязаліся спрыяць індывідуальнай і калектыўнай мабільнасці, здароваму ладу жыцця і фармаванню актыўнай грамадзянскай пазіцыі сярод моладзі.

## ПРАЦЭДУРА ДАЛУЧЭННЯ ДА ЧАСТКОВАГА ПАГАДНЕННЯ:

### Для краін – сяброў Савета Еўропы і удзельніц Еўрапейскай культурнай канвенцыі:

Гэтыя краіны-удзельніцы могуць далучыцца да Частковага пагаднення ў любы час, накіраваўшы заяву пра гэта Генеральнаму сакратару.

Для гэтага міністр замежных спраў або Сталы прадстаўнік краіны пры Савеце Еўропы накіроўвае афіцыйны ліст або вербальную ноту на імя Генеральнага сакратара Савета Еўропы.

## Для краін, якія не ўваходзяць у Савет Еўропы і не ўдзельнічаюць у Еўрапейскай культурнай канвенцыі:

Згодна з прапановай Еўрапейскай асацыяцыі моладзевых карт і каардынацыйнай рады Частковага пагаднення, Камітэт міністраў можа запрасіць любую краіну, якая ня ёсць сябрам Савета Еўропы, далучыцца да Частковага пагаднення пасля кансультацый з іншымі краінамі, якія ўжо удзельнічаюць у пагадненні, не з’яўляючыся сябрамі Савета Еўропы.

## Савет Еўропы

Савет Еўропы – гэта агульнаеўрапейская палітычная арганізацыя, створаная ў 1949 годзе з мэтай садзейнічаць міжнароднаму супрацоўніцтву, падтрыманню міра, развіццю дэмакратыі і абароне правоў чалавека ва ўсёй Еўропе. Ён выпрацоўвае агульныя адказы на агульныя праблемы ва ўсіх сферах чалавечага жыцця за выключэннем эканамічнай і ваеннай сфер. Савет Еўропы, у які ўваходзяць 47 краін і 50 краін-удзельніц Еўрапейскай культурнай канвенцыі, аб’ядноўвае 820 мільёнаў еўрапейцаў.

## Моладзевы сектар Савета Еўропы

Савет Еўропы падтрымлівае актыўную ролю моладзі ў грамадстве праз шэраг агульнаеўрапейскіх мерапрыемстваў, якія праводзяцца як шляхам міжурадавага супрацоўніцтва, так і праз адукацыйныя мерапрыемствы для моладзевых няўрадавых арганізацый і лідэраў моладзі. Важнымі інструментамі для ажыццяўлення гэтай дзейнасці з’яўляюцца Еўрапейскія моладзевыя цэнтры ў Страсбургу і Будапешце, Еўрапейскі моладзевы фонд и Частковае пагадненне аб моладзевай мабільнасці па моладзевых картах.

## КАНТАКТ У САКРАТАРЫЯЦЕ САВЕТА ЕЎРОПЫ

Directorate of Democratic Participation
Youth department (Agora Building)
Youth Policy Division
Partial Agreement on Youth Mobility through the Youth Card

F-67075 Strasbourg Cedex
Tel.:+33 (0)3 88 41 29 98

**youthmobility@coe.int**
**https://www.coe.int/en/web/youth/youth-mobility**

Prems 072421

BEL

**www.coe.int**

Савет Еўропы з'яўляецца вядучай арганізацыяй кантынента па абароне праў чалавека. У склад гэтай арганізацыі ўваходзяць 47 дзяржаў-членаў, у тым усе члены Еўрапейскага саюза. Усе дзяржавы-члены Савета Еўропы падпісалі Еўрапейскую Канвенцыю па абароне Праў чалавека і асноўных свабод - дамову, распрацаваную для абароны праў чалавека, дэмакратыі і вяршынства закона. Еўрапейскі суд па правах чалавека назірае за рэалізацыяй Канвенцыі ў дзяржавах-членах.

partial agreement on youth mobility through the EUROPEAN YOUTH CARD

COUNCIL OF EUROPE
CONSEIL DE L'EUROPE